РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ
МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ

# Вызначаючы вынікі года

Чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства адбылася 17 студзеня. Дзякуючы сродкам відэасувязі, у пасяджэнні таксама паўдзельнічалі начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

Былі падведзеныя папярэднія вынікі выканання Дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" за 2022 год. Летась у краіне прыстасавалі пад сучасныя патрэбы 14 помнікаў архітэктуры, а 18 элементаў нематэрыяльнай культуры ўнесеныя ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. Акрамя таго, пабудавана, рэканструявана або адрэстаўравана 17 аб'ектаў інфраструктуры сферы культуры.

Для ўстаноў адукацыі сферы культуры за 2022 год набыта 1672 музычныя інструменты. Колькасць дакументаў у электроннай форме склала 18,7 % ад фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, а доля алічбаваных прадметаў у музеях краіны — 16,7 % ад агульнага фонду. Міністр звярнуў увагу на неабходнасць вывучыць досвед камерцыялізацыі віртуальных экскурсій па музеях.

Абмяркоўваліся таксама пытанні арганізацыі Фестывалю Саюзнай Дзяржавы "Творчасць юных", які адбудзецца ў чэрвені ў Маскве. Адборачныя туры пройдуць анлайн. Пераможцаў вызначыць журы, у склад якога ўвойдуць беларускія і расійскія артысты.